БРЫЛЕЎСКІ летапіс

№ 31 (78)
лістапад
2008 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца
з мая 2006 г.

У Рэгіны ЖУКАВАЙ добры настрой!

с.4-5

Свята!

Улада

с.2-3

майстра

с.6

Зіма

с.8

ЛАМІНАТ.org

Здаровы лад

Выканкам працуе...

27 лістапада 2008 года адбылося чарговае паседжанне выканкама Брылеўскага сельскага Савета. Галоўнае пытанне павесткі дня - "Аб рабоце сельвыканкама, устаноў адукацыі, культуры, аховы здароўя па фарміраванню здаровага ладу жыцця і развіццю фізічнай культуры і спорта".

У сваёй прамове старшыня выканкама Уладзімір Ільіч Мажораў падкрэсліў, што пытанне гэтае ставіцца на ўсіх узрознях, і асаблівая ўвага надаецца аграгарадкам. Там ёсць адказныя асобы, якія непасрэдна займаюцца гэтымі справамі. У аўторак, 25 лістапада, было паседжанне райвыканкама, дзе таксама разглядалася гэтае важнае пытанне. Адзначалася, што склалася даволі складаная сітуацыя: некаторыя бацькі нідзе не работаюць, п'янствуюць, і дзеці практычна знаходзяцца без належнага нагляду. У адпаведнасці з Дэкрэтам № 18 гэтыя бацькі павінны аплочваць утрыманне дзяцей (па 194.000 рублей у месяц), але, як паведаміў начальнік раённага аддзела адукацыі, толькі 33% бацькоў даюць грошы. Астатнія і не працуюць, і нічога не аплочваюць. Падымалі міліцыю – тыя рукамі разводзяць, бо няма такога закона, каб прымусіць бацькоў. Кіраўнікі прадпрыемстваў адзначылі, што згодна Дэкрэту трэба браць такіх людзей на працу, але калі яны п'янствуюць, то трэба іх звальняць з працы. І такая нестыкоўка ў заканадаўстве прывяла да таго, што склалася вельмі складанае становішча ў гэтым накірунку. І прыйшлі да такой высновы, што міліцыя, сельвыканкамы, медыцына, культура, грамадскасць павінны вадзіць такіх людзей на працу. Як выйсце, апошнім часам ідуць такія размовы, што будуць ствараццца працоўныя лагеры для такіх бацькоў і што толькі з-пад палкі можна іх прымусіць працаваць на сваіх дзяцей.

У.І.Мажораў

Н.І.Рамашкевіч

К.А.Новікава

А.М.Яцкова

А.У.Аляксейкова

П'янства -- біч нашага грамадства, які мае разбуральную моц. І ў нас на мясцовым узроўні можна бачыць такія праявы. Ёсць асобныя людзі, з якімі вельмі складана размаўляць пра здаровы лад жыцця. Дайшло да таго, што, напрыклад, у некаторых сем'ях у Макаранцах ніяк не могуць пазбавіцца ад педыкулёзу, а гэта вельмі трывожны сігнал. У сем'ях, дзе ўсё нармальна, такога не бывае. Тут ад нас патрабуюцца вялікія намаганні.

Трэба адзначыць, што пытанні здаровага ладу жыцця пачалі знаходзіць актыўнае адлюстраванне ў рабоце ідэялагічных структур нашага раёна -- напрыклад, пачалі выпускацца адпаведныя наглядна-агітацыйныя матэрыялы. Патрэбна актывізацыя працы устаноў культуры, адукацыі, мясцовага ФАПа па арганізацыі тэматычных мерапрыемстваў і тлумачальнай работы сярод насельніцтва. Не сакрэт, што сучасная моладзь цягнецца да спіртнога. А калі, напрыклад, ўзяць платныя папаслугі ў культуры, то атрымліваецца, што з-за гэтага маладыя людзі не могуць трапіць на тую ж дыскатэку, цягаюцца па вёсцы і знаходзяць радасць у стакане. Неабходна гэтую

сітуацыю браць пад кантроль і агульнымі намаганнямі весці мэтанакіраваную работу. Бо аднаму выканкаму тут цяжка працаваць – трэба каб усе дапамагалі. Калі ў тую ж праблемную сям'ю разам з работнікамі выканкама прыйдуць прадстаўнікі школы, медыцыны, культуры, то і рэакцыя будзе зусім іншай. Таксама неабходна шырэй далучаць да справы работнікаў інспекцыі па справах непаўналетніх, бо яны ў нас зусім рэдкія госці.

Асобую ўвагу трэба надаць развіццю фізкультуры і спорту. Мы ведаем, што ў Кадзінскай школе на гэта звяртаецца вялікая ўвага, і нашы дзеці маюць магчымасць там займацца, а на спаборніцтвах дабіваюцца высокіх вынікаў. З іх будуць браць прыклад іншыя нашы дзеці, падцягвацца, і ўсё гэта будзе даваць агульны "плюс".

Неабходна адзначыць станоўчую працу нашых медыцынскіх устаноў і ў Брылях, і ў Макаранцах. Людзі там на сваіх месцах, працуюць старанна. І трэба каб гэты высокі ўзровень не зніжаўся.

Падагульняючы, трэба сказаць, што ўся моц дзяржавы павінна быць скіравана ў накірунку замацавання здаровага ладу наша жыцця, бо ад гэтага залежыць наша будучыня.

Загадчыца Брылеўскага ФАПа, дэпутат Алеся Уладзіміраўна Аляксейкова нагадала аб тым, што алкагалізм – хранічная і невылечная хвароба. Тут бываюць і рэмісіі, і абвастрэнні, але калі чалавек робіцца алкаголікам, то гэта назаўсёды і патрэбен пажыццёвы дыспансэрны ўлік. Азіная мера прафілактыкі – ратаваць тых, хто яшчэ, як кажуць, "на плаву".

Пільную ўвагу трэба надаваць падлеткам і моладзі, бо ўжыванне піва і віна вядзе да не вельмі прыемных вынікаў. Асабліва небяспечным з'яўляецца піва, бо лічыцца, што так званы "піўны" алкагалізм значна цяжэйшы за "гарэлачны". Лічыцца, што калі чалавек выпівае спіртнога некалькі разоў на тыдзень, то гэта ўжо скрытны алкагалізм.

Галоўнае – якія абставіны складаюцца ў сям'і. Калі школа будзе змагацца, а бацькі сваімі паводзінамі будуць накіроўваць дзяцей зусім у іншы бок, то ўся станоўчая праца змарнуецца. Дзеці заўсёды бяруць прыклад з бацькоў. У нас толькі адзінкавыя сем'і, дзе бацькі нешта тлумачаць дзецям пра ўсё гэта.

Гэту слушную думку падтрымала землеўпарадчык выканкама Кацярына Аркадзьеўна Новікава. Па яе меркаванню менавіта сям'я з'яўляецца самым галоўным фактарам, які фарміруе і светапогляды дзяцей, і іх станоўчыя адносіны да жыцця.

Дырэктар Брылеўскага СДК Мікалай Адамавіч Яцкоў у сваім выступе падкрэсліў, што Дом культуры галоўнае ў гэтым накірунку бачыць у працы з падлеткамі і моладдзю – каб як мага далей адцягнуць іх ад багны п'янства і алкагалізма. Ладзяцца розныя мерапрыемствы, працуюць калектывы мастацкай самадзейнасці. Вялікая ўвага надаецца сумеснай працы з школай. І такую практыку трэба працягваць і надалей. Таксама трэба выкарыстоўваць у гэтым накірунку магчымасці мясцовага выдання "Брылеўскі летапіс", бо ўсе мы ведаем, якім уплывам валодае друкаванае слова.

Свае меркаванні таксама выказалі сакратар выканкама Брылеўскага сельсавета Надзея Іванаўна Рамашкевіч і бібліятэкар Брылеўскай бібліятэкі, дэпутат Ала Міхайлаўна Яцкова.

Па абмеркаванаму пытанню была прынята адпаведная пастанова.

Таксама былі разгледжаны пытанні, звязаныя з спадчыннымі справамі, з выкананнем патрабаванням зямельнага заканадаўства.

А Данілаўна не разумее...

Прыемна бачыць, калі на вуліцах нашых вёсак з'яўляецца нешта новае і прыгожае. Вось, напрыклад, з'явіліся новае адзенне калодзежа і агароджа вакол яго ў вёсцы Качурына праз дарогу ад хаты Яўгеніі Данілаўны Смяшковай -- і неяк аж святлей зрабілася ў гэтым кутку. Вялікі дзякуй сельсавету!.. Але глядзіць на гэту прыгажосць Данілаўна і не разумее аднаго: куды дзеўся ладны кавалак плоту як раз насупраць яе ўчастка? Ад пачатку Качурына жоўта-блакітная агароджа ідзе акурат да яе надзелу, потым метраў на дваццаць знікае і ад гэтага вось калодзежа зноўку ідзе далей. І каровы тут у разведку ходзяць, і вецер свішча, і неяк не вельмі зразумела -- ці то будаўнічых матэрыялаў не хапіла, ці то гэта дызайн такі сучасны. Здаецца, сельсавету трэба неяк вызначыцца і давесці да ладу маючую месца вясковую прыгажосць, -- каб ветэран працы Яўгенія Данілаўна Смяшкова ўрэшце ўздыхнула з палёгкай.

Мікола ЯЦКОЎ.

Восень

28 лістапада 2008 года ў Брылеўскай школе - садзе прайшоў традыцыйны восеньскі баль. Вядучая Марына Міхайлаўна Бірукова прапанавала прысутным пайсці ў казачную краіну, дзе жывуць браты Верасень, Кастрычнік і Лістапад, дзе садавіна з гароднінай размаўляюць і жартуюць, дзе гучыць музыка і віхурацца танцы. Зразумела, што ўсе, хто быў у залі, там і апынуліся. І разам з Восенню пачалі гуляць у вясёлыя гульні -- збіраць грыбы і бульбу, дасказваць словы і дружна дэкламаваць "Лі-ста-пад!" пад музыку вядомай песні "В траве сидел кузнечик". Асабліва весела было, калі спатрэбілася збіраць шышкі: спачатку дружна танцаваць, а пры заканчэнні музыкі хапаць шышку, -- паколькі кожны раз на адну шышку рабілася менш, то адзін удзельнік і выбываў. Не ўсім такое становішча падабалася -- Ганна Ермалаева нават расстроілася, -- але, як кажуць, перамагла дружба. І фінальная песня пра восень была дружна падтрымана ўсімі прысутнымі.

Вольга МАЙБУРАВА.

Фотаздымкі М.Яцкова.

Карына Бірукова - Восень

Кірыл Куляшоў, Антон Трухмінаў і Аляксей Аляксейкоў

Н.А.Ярмаш

Зміцер Мяшкоў і сябры

Яна Пшанічная

Балельшчыкі...

Дар'я Старс

Юлія і Яна Какоўка

KAMUNIKAT.org

Залатая...

А.М.Куляшова, Г.Ф.Жукава і К.М.Жукава

Збіраем грыбы...

Марына Пухоўская -- нібы царэўна Несмяяна

Вядучая -- М.М.Бірукова

Кастусь Пятроў

Карына Паршёва

Доктар Айбаліт

Верш у выкананні Арцёма Пухоўскага

Надзея Журава


І.Ф.Пракопчык і Т.Ф.Прудзікава

А.М.Яцкова

“А ўмовы гульні такія!..”

Танцуюць Цімафей Баброў і Мікіта Жукаў

Т.М.Васюрэнка і В.М.Мяшкова

Збіраем бульбу...

Фінальная песня

Залатыя рукі

10.09.2008 г.

Міхаіл Кузьміч ДУБРОЎСКІ з вёскі Канстанцінаўка імкнецца ўсё рабіць сваімі рукамі. І ўсё, што ствараюць гэтыя працалюбівыя рукі, заўсёды вельмі прыгожае і трывалае - хоць то карзіна з лазы ці садовая альтанка ў атачэнні духмяных кветак. Міхаіл Кузьміч лічыць, што чалавек павінен жыць прыгожа і як мага болей ствараць прыгажосці. Каб і памяць добрая засталася, і каб будучыня мацавалася гэтым найважнейшым падмуркам.

Слёзы сеньёры Магдалены

Аляксандр Казека

У брылеўскім выдавецтве “Справа” выйшаў зборнік песен “Единственный друг” кампазітара Міколы Яцкова на вершы вядомага магілёўскага паэта Аляксандра Казекі. Там змешчана і песня “Осень”, з якой звязана цікавая гісторыя...

Ірына Казека -- малодшая дачка А.Казекі -- па праграме аздараўлення сёлета вось ужо сёмы раз пабывала ў сонечнай Іспаніі ў мястэчку Альбокс, што месціцца недалёка ад прыморскага горада Алмерыя.

На гэты раз сярод падарункаў, прызначаных гасціннаму сямейству Мелладо, быў і кампакт-дыск з запісам песень са зборніка “Единственный друг”. Спадарыня Магдалена Мелладо ўважліва ўсё праслухала, і ёй вельмі спадабалася менавіта песня “Осень”. Яна потым кожны дзень уключала гэту песню, слухала і... плакала. Прычым, сеньёра Магдалена, не разумеючы слоў, вельмі добра пачула сум восеньскага настрою і ўзнёсласць пачуццяў песні. Гэта хвалявала, ну, а дзе хваляванне, там блізка і светлыя слёзы. Відаць, такой і павінна быць сапраўдная песня -- каб адразу класціся на сэрца.

Ала ЯЦКОВА.



Ірына Казека і Магдалена Мелладо

Брылеўская бібліятэка інфармуе...

№ 11, 2008 г.

Вядомы беларускі паэт Анатоль ЗЭКАЎ прапануе свой погляд на родную вёску:

* * *

А ў вёсцы зоркі іншыя,
Чым там, у горадзе.
Яны
Глядзяць з гары суцішана
І калыхаюць
нашы
сны.
Падмірґваюць
Пабліскваюць,
Нібыта даўнія сябры,
І гэткімі здаюцца блізкімі:
Руку працягнеш --
і бяры.
А ў вёсцы зоркі чыстыя.
На іх я ў цішыні начной
Гляджу, гатовы выстаяць
Ажно да раніцы свмой.

Анатоль ЗЭКАЎ

Цытата

Калі вы хочаце, каб вашу скаргу прачыталі, напішыце яе не адной старонцы.

Томас Вудра Вільсан (1856-1924), амерыканскі палітычны і дзяржаўны дзеяч, 28-ы прэзідэнт ЗША.

АРГУМЕНТЫ И ФАКТЫ НАША ГАЗЕТА

№ 45, 2008 г.

После распада СССР в Беларуси родилась идея назвать национальную валюту талерами. Этот вопрос рассматривался на Президиуме Верховного Совета. За талеры высказался только один человек -- народный поэт Нил Гилевич, все остальные члены Президиума проголосовали за рубель. Поэтому в 1993 году в Германии были напечатаны белорусские рубли. Изготовление и доставка самолётом купюр обошлась стране в 20 млн. долларов. Однако эти купюры так и не были пущены в оборот -- из-за высокой инфляции. И изготовленные деньги положили в хранилище Госбанка.

«Секретные» деньги цветом и размером были похожи на немецкие марки. На банкнотах изобразили великих граждан Беларуси: Франциска Скорину, Максима Богдановича, Якуба Коласа, Янку Купалу… и Павлинку -- как собирательный образ белорусской красавицы. Только Калиновского на деньгах не было -- возникли споры, так как имелись факты, что он грабил банки.

ЗВЯЗДА

1. 11. 2008 г.

У ДОБРЫ ШЛЯХ!

Сярод славян добра ведалі, што ад'язджать далёка з дому неабходна было ў пэўныя дні тыдня -- аўторак і чацвер. Асабліва неспрыяльным днём для далёкай дарогі лічылі панядзелак.

- У дні, калі святкавалі пачатак года (Каляды), заканчэнне жніва, у дзень Раства Хрыстовага і Багародзіцы і іншыя вялікія святы, сям'я павінна была быць дома ў поўным складзе. Таму ў такія святочныя дні звычайна ніколі нікуды не збіраліся.
- Катэгарычна забаранялася месці і мыць падлогу ў той дзень, калі хтосьці са сваякоў некуды ад'язджаў.
- Самай распаўсюджанай негатыўнай прыкметай і сёння з'яўляецца неабходнасць вярнуцца з паловы шляху: не будзе шанцаваць у такой паездцы.
- Вельмі важным было ў пабудове вясельнага “маршруту” зрабіць так, каб “вясельны” і “пахавальны” шляхі не сустракаліся (не перакрыжоўваліся). Сустрэча вясельнага картэжу і пахавальнай працэсіі была даволі непажаданай -- яна прадказвала смерць першага дзіцяці ў сям'і маладых. Нездарма шлях ад дома да могілак маркіравалі галінкамі елкі. Хадзіць па гэтай “дарозе смерці” катэгарычна забаранялася.
- Пераход дарогі перад ідучым, едучым чалавекам, жывёлай, пахавальнай ці вясельнай працэсіі заўсёды выклікаў негатыўныя адносіны. Лічылася, што толькі дрэнны чалавек будзе рабіць такія дзеянні, каб адняць здароўе, наслаць порчу, адняць малако ў каровы, нерашкодзіць вяселлю і г.д.
- Верхам непавагі лічылася перайсці каму-небудзь дарогу з пустым вядром. Да такога чалавека ставіліся вельмі негатыўна, выключалі яго з усіх дзеянняў у вёсцы.
- Лічылася, што чалавек, які пяройдзе дарогу пахавальнай працэсіі, хутка сам захварэе і памрэ.
- Паўсюдна існавала забарона пазычаць што-небудзь суседзям, якія жывуць цераз вуліцу (цераз дарогу), а вось суседзям, якія жывуць з вамі на адным баку вуліцы -- дазвалялася.

МІВ Магілёўскія ведамасці

1. 11. 2008 г.

Учёные провели эксперимент, задействовав в нём детей, которые занимались музыкой по 2,5 часа в неделю. Эксперимент продолжался на протяжении 15 месяцев. Выяснилось, что у детей, занимающихся музыкой регулярно, объём мозолистого тела головного мозга, отвечающего за обмен информацией между правым и левым полушариями, увеличился в среднем на 25%.

СБ Беларуская слова

2. 12. 2008 г.

Ох, уж эта зависть!.. Одно из самых плохих проявлений человеческих чувств. Завидуют всему! Но в первую очередь -- таланту, уму, успеху, богатству… Когда у Любови Орловой, знаменитой советской артистки, спросили: «В чём секрет вашей молодости?»- она ответила неожиданно и просто: « Я никогда и никому не завидовала...»

Любовь ОРЛОВА

Прозвішча падпісчыка

Дарога ў зіму

18 лістапада 2008 года подых надыходзячай зімы паклаўся белым покрывам на Брылі і ваколіцы. Было ўрачыста-ціха, і толькі нізкія аблокі, пралятаючы, углядаліся ў цёмнае люстэрка павольнай Рудэі. І хоць нядоўгім было жыццё першага снега, але прыродная пераемнасць, як і заўсёды, зноўку пазначылася, несучы з сабой узнёслы роздум аб жыцці і Вечнасці...

Васіль Іванавіч ЕРМАШКЕВІЧ (1942-2008)

29 лістапада 2008 года на 67-м годзе жыцця памёр Васіль Іванавіч Ермашкевіч.

Ён нарадзіўся 13 верасня 1942 года ў вёсцы Канстанцінаўка, і вайна сваім чорным крылом зачапіла пачатак яго жыцця. Ён не зведаў бацькоўскай ласкі, і толькі матуля Марыя вяла па неспакойнаму жыццёваму мору карабель іх сям’і. Ад самага маленства Васіль Іванавіч пакутаваў ад цяжкай хваробы, але змагаўся з ёю, імкнучыся быць карысным. Па меры магчымасці працаваў спачатку ў мясцовым калгасе “Чырвоная Зорка”, а потым і ў калгасе імя Ільіча. Вызначаўся стараннай працавітасцю і заўсёды чуў ад сваіх таварышаў толькі станоўчыя водгукі.

На жаль, не атрымалася ў Васіля Іванавіча стварыць сям’ю і адправіць у будучыню сваіх нашчадкаў. Апошнім часам за ім даглядала сястра Наталля Іванаўна, і менавіта там светлае цяпло сямейнага ачага саграваала да самага скону чуйнае сэрца гэтага добрага чалавека...

Рознымі бываюць лёсы і жыццёвыя шляхі. Васілю Іванавічу нічога не давалася лёгка ў гэтым жыцці. Але ён, негледзячы ні на што, ішоў наперад, адчуваючы зямлю пад нагамі і размаўляючы з Небам. І мы будзем памятаць пра гэта.

Бывай, Васіль Іванавіч!..

АДНАВЯСКОЎЦЫ.

Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь для жыхароў Брылеўскага рэгіёна і наваколля.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 299 асобнікаў.

Адрас для карэспандэнцыі:
213107 Магілёўскі раён п/а Брылі
тэл. маб. +375293732886
e-mail: brylibelarus@gmail.com
© “Брылеўскі летапіс”, 2008

Заснавальнік і рэдактар
Мікола ЯЦКОЎ